

Тацццяна
МАНЦЭВІЧ

# ЭКАНОМІКА І ДЗЕЦІ

## ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ ДА ЭКАНАМІЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

**Эканоміка і дзеці? Сямейны бюджэт і дашкольнікі? Гэтыя і многія іншыя пытанні ў апошні час хвалююць не толькі бацькоў і выхавальнікаў, а і выкладчыкаў, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку педагагічных кадраў. На першым этапе навучання мы знаёмім студэнтаў з азамі, тэарэтычнымі асновамі эканамічнага выхавання ў курсе «Дашкольнай педагогікі».**

ВАЖНЫ этап у эканамічным выхаванні дзяцей звязаны з жыццём і дзейнасцю вялікага чэшскага педагога Я.А. Каменскага. У працы «Мацярынская школа, ці Пра клапатлівае выхаванне юнацтва ў першыя шэсць гадоў» вучоны дэталёва выклаў методыку эканомікі, з якой дзіця павінна даведацца, хто якую ролю выконвае ў гаспадарцы. Таксама вялікую цікавасць выклікаюць погляды А.С. Макаранкі. У «Кнізе для бацькоў» ён пісаў, што неабходна так выхоўваць дзіця, каб яно было актыўным. І ў той жа час неабходна ствараць тармазы для шкодных жаданняў. Вырашыць пытанне выхавання — гэта значыць знайсці пачуццё меры паміж актыўнасцю і тармазамі.

Сучасны погляд на праблему эканамічнага выхавання дашкольнікаў пачынаецца ў канцы 80-х гадоў XX стагоддзя. У часопісе «Дошкольное воспитание» (1989, № 1) быў надрукаваны артыкул А. Шатавай «Ці патрэбна і навошта дашкольніку эканамічнае выхаванне?». Аўтар падкрэслівала, што «перадумовы будучай эканамічнай дзейнасці складваюцца вельмі рана, і калі не фарміраваць іх своечасова, могуць праявіцца негатыўныя бакі ў паводзінах дзяцей...»

На артыкул пайшлі водгукі, і разварнулася дыскусія, у якой прынялі ўдзел педагогі-практыкі і вучоныя. Яны намагаліся адказаць на пытанні:

- *Якім павінен быць змест эканамічнага выхавання дашкольнікаў?*
- *Якімі карыстацца метадамі і сродкамі?*
- *Як ажыццяўляць падрыхтоўку педагагічных кадраў?*
- *Хто выконвае галоўную ролю ў эканамічным выхаванні дашкольнікаў: сям'я ці дзіцячая ўстанова?*

У Беларусі назапашаны пэўны тэарэтычны і практычны вопыт у гэтай галіне. Важным з'яўляецца эканамічнае выхаванне ў дзіцячым садзе, якое дазваляе фарміраваць пэўны тып мыслення і паводзін на аснове каштоўнасцей, прынятых у грамадстве.

Будучыя спецыялісты актыўна разглядаюць умовы эканамічнага выхавання:

1. *Узаемасувязь з іншымі бакамі выхавання.*
2. *Уключэнне дашкольнікаў у розныя віды дзейнасці, у ходзе якіх ідзе засваенне, замацаванне эканамічных тэрмінаў, а таксама абмеркаванне такіх якасцей, як беражлівасць і арганізаванасць.*
3. *Выразнае вызначэнне зместу эканамічнага развіцця, аб'ёму ўяўленняў і ўменняў дашкольнікаў.*
4. *Узаемасувязь сям'і і дашкольнай установы.*
5. *Стварэнне развіваючага асяроддзя: набыццё неабходных дапаможнікаў, распрацоўка метадычных рэкамендацый.*
6. *Эканамічныя веды саміх дарослых — прыклад, які з'яўляецца моцным стымулам для дзяцей.*
7. *Дыягностыка і карэкцыя эканамічнай выхаванасці дашкольнікаў.*
8. *Імкненне педагогаў да самаўдасканалення, зацікаўленасць у вырашэнні праблем.*

На практычных занятках студэнты вызначаюць сродкі эканамічнага выхавання дашкольнікаў. Як важнейшыя раскрываюцца заняткі, экскурсіі, дыдактычныя гульні. Пры гэтым гульнявая дзейнасць характарызуецца як вядучая. Аналіз даследаванняў сведчыць, што асноўная ўвага ўдзяляецца сюжэтна-ролевым («Магазін», «Рынак») і дыдактычным гульням («Якія эканамічныя словы я ведаю?», «Шторм» (выбар прадметаў, неабходных для выжывання на бязлюдным востраве) і інш.).

Акрамя навучальнай і гульнявой дзейнасці, у эканамічным выхаванні рэкамендуецца выкарыстоўваць і іншыя сродкі:

- *пазнавальна-практычную дзейнасць;*
- *працоўную дзейнасць;*
- *зносіны з бацькамі (сумеснае разглядванне альбомаў, удзел у працы, абмеркаванне пакупак);*
- *самастойную мастацкую дзейнасць (падрыхтоўка падарункаў родным і інш.).*

Курсавыя і дыпломныя работы па эканамічнай тэматыцы з'яўляюцца важнейшым этапам падрыхтоўкі студэнтаў да работы з дзецьмі і іх бацькамі. Тэарэтычныя і практычныя навыкі фарміруюцца ў студэнтаў таксама ў час практыкі ў дашкольных установах.

**Тацццяна Вітальеўна МАНЦЭВІЧ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзілася ў Мінску, закончыла факультэт дашкольнага выхавання (1979 г.) і аспірантуру (1984 г.) Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. На факультэце працуе з 1984 года. Мае 24 публікацыі па праблемах выхавання дзяцей і моладзі.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ